7. *Кунин, А. В.* Основные понятия английской фразеологии как лингвистической дисциплины и создание англо-русского фразеологического словаря : автореф. дис. ... д-ра филол. наук : 10.02.02 / А. В. Кунин. – М., 1964. – 47 с.
8. *Райхштейн, А. Д.* Сопоставительный анализ немецкой и русской фразеологии / А. Д. Райхштейн. – М. : Высш. шк., 1980. – 143 с.
9. *Солодуб, Ю. П.* Национальная специфика и универсальные свойства фразеологии как обьект лингвистического исследования / Ю. П. Солодуб // Филол. науки. – 1990. – № 6. – С. 55–65.
10. *Солодуб, Ю. П.* Сопоставительный анализ структуры лексического и фразеологического значений / Ю. П. Солодуб // Филол. науки. – 1997. – № 5. – С. 43–54.
11. *Солодухо, Э. М.* Вопросы сопоставительного изучения заимствованной фразеологии / Э. М. Солодухо. – Казань : Изд-во Казан. ун-та, 1977. – 170 с.
12. *Лепешаў, І. Я.* Слоўнік фразеалагізмаў. У 2 т. / І. Я. Лепешаў. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 2008. – Т. 1. – 672 с.; Т. 2. – 704 с.
13. *Rey, A.* Dictionnaire d'expressions et locutions / A. Rey, S. Chantreau // Le Robert. – Paris, 2007. – 1086 p.
14. *Сафина, Р. А.* Факторы межъязыковой эквивалентности фразеологизмов немецкого и русского языков / Р. А. Сафина // Русская и сопоставительная филология : системно-функциональный аспект : материалы итоговой науч. конф. Казан. гос. ун-та, 5–10 февраля 2003 г. / Казан. гос. ун-т. – Казань, 2003. – С. 167–170.
15. *Лепешаў, І. Я.* Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І. Я. Лепешаў. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2004. – 443 с.
16. *Рецкер, Я. И.* Теория перевода и переводческая практика / Я. И. Рецкер. – М. : Междунар. отношения, 1974. – 216 с.

The article deals with the problem of interlanguage phraseological correlation. The main indicators of phraseological equivalence are identified. The Belarussian-French phraseological full and partial equivalents with the meaning of a person's physical state are analyzed in detail.

*Поступила в редакцию 09.09.2019*

**Н. У. Чайка**

# ЗВЫШФРАЗАВЫЯ ТЫПЫ НЯПОЎНЫХ КАНСТРУКЦЫЙ У БЕЛАРУСКАЙ І КІТАЙСКАЙ МОВАХ

Статья посвящена исследованию структурной организации неполных предложений в белорусском и китайском языках. В работе выявлены универсальные и специфические параметры типологии синтаксических единиц в языках флективного и изолирующего типов – возможность структурной дифференциации предложений, особенности синтаксической связи и порядок слов в них; определены и систематизированы сверхфразовые типы неполных предложений в белорусском и китайском языках, а также выявлены факторы их типо- и видообразования.

Шырокае функцыянаванне структурна-сінтаксічных мадыфікацый у беларускай і кітайскай мовах патрабуе іх комплекснага вывучэння. Сінтаксічная непаўната разглядалася ў рамках розных сінтаксічных школ і кваліфікавалася на аснове тэарэтычнай базы кожнай з іх. Метадалагічныя прынцыпы структурнай школы дазвалялі кваліфікаваць няпоўныя канструкцыі як варыятыўныя ў адносінах да поўных (Лі Цзінсі, Ляо Сюйдунь, Фан Сяо, Д. Арма, А. В. Грудзева [1; 2; 3; 4; 5]). Іх камунікатыўная паўнавартасць, на думку даследчыкаў, з'яўляецца вынікам узаемадзеяння рознаўзроўневых моўных адзінак. У межах функцыянальнай сінтаксічнай школы непаўната сказа тлумачылася зыходзячы з дастатковасці яго фармальна-граматычнага саставу ў канкрэтным кантэксце (П. А. Лекант, Г. А. Золатава, Ван Вэйсянь, Чжу Дэсі [6; 7; 8; 9]).

У канцэпцыях сінтаксічных тыпалогій (А. Я. Кібрык, Г. П. Мельнікаў, А. У. Цымерлінг, Ван Вэйсянь, Чэн Чанлай і інш.) праводзілася параўнальнае вывучэнне структурных і функцыянальных уласцівасцей моў незалежна ад характару генетычных адносін паміж імі [10; 11; 12; 13]. Кваліфікацыя структурна-сінтаксічных мадыфікацый ажыццяўлялася шляхам выяўлення іх універсальных і спецыфічных рыс і аб'яднання аб'ектаў у класы, групы і падгрупы. У выніку праведзенага даследавання былі акрэслены універсальныя асаблівасці сінтаксічных сістэм розных моў – наяўнасць незамешчанай сінтаксічнай пазіцыі і магчымасць яе кампенсацыі рознымі моўнымі сродкамі. Да спецыфічных уласцівасцей адносілі парадак слоў, які можа быць свабодным і фіксаваным, наяўнасць або адсутнасць дзеяслоўнага кіравання, канстантны або пераменны характар суб'ектна-прэдыкатнага комплекса, якія істотна ўплываюць на тыпа- і відаўтварэнне няпоўных сказаў у розных мовах.

Як паказаў аналіз навуковай літаратуры, пытанню сінтаксічнай непаўнаты прысвечана значная колькасць прац. Пры гэтым на сённяшні дзень не вывучаны тыпалагічныя асаблівасці сінтаксічнай непаўнаты ў беларускай і кітайскай мовах. Назваены напрамак даследавання з'яўляецца сучасным і перспектыўным. Актуальнасць вывучэння дадзенай сінтаксічнай з'явы абумоўлена адсутнасцю ў навуковай літаратуры даследавання няпоўных сказаў у беларускай і кітайскай мовах, а таксама неабходнасцю выявіць структурныя тыпы няпоўных сказаў у беларускай і кітайскай мовах.

Мэта даследавання ў артыкуле – выявіць звышфразавыя тыпы няпоўных канструкцый у беларускай і кітайскай мовах.

У структуры звышфразавага адзінства *дзейнік* можа выступаць у якасці кампенсаторнага кампанента. Тэарэтычныя і метадалагічныя прынцыпы тэорыі тэксту дазваляюць вызначыць функцыянальную тоеснасць суб'ектаў у ім. Класіфікацыю няпоўных сказаў мэтазгодна будаваць на аснове логіка-семантычных і семантыка-сінтаксічных адносін кампанентаў у структуры тэксту. Названыя адносіны прадвызначаюць аднаразовую эксплікацыю дзейніка ў кампаненце звышфразавага адзінства: *Вясёлай чародкаю дзяўчаты знікаюць з вестыбюлю. Галіна папраўляе валасы. З'яўляецца Святлана,*

*кволая, стомленая. Падыходзіць да гардэроба, сядае на лаўку, пачынае развязваць тасёмкі халата* (А. Дзялендзік); С в я т л а н а. *А ён не пускаў. Хацеў, каб я паступала ў яго інстытут. Я адмовілася. Прыехала ў Мінск і паступіла сама. Паглядзі ў акно. Учора ўвечары, калі мы выходзілі з клінікі, ён стаяў на тым жа месцы* (А. Дзялендзік). У беларускай мове назіраюцца выпадкі, калі кампенсаторны кампанент змяняе сінтаксічную функцыю і набывае пераменны характар: Г а с т р ы т *(з адчаем). А я з бальніцы ўцёк... Вазьміце мяне... Коляць, а мне ўсё цяжэй... Парашкамі кормяць, а мне ўсё страшней... Не магу больш... Цяжка... Холадна... Страшна без вас... Я, Васіль... я тваю смерць на сябе вазьму... За дваімі яна не прыйдзе... Толькі не праганяйце мяне... Пашкадуйце...* (А. Дудараў). Таксама назіраюцца выпадкі безаб’ектнага ўжывання няпоўных сказаў: *Дзе ж яшчэ? Я во падумаю-падумаю, а што, калі б мае бацька-маці ўзялі дый не нарадзілі мяне?! Га? Ды я б ім гэтага ніколі не дараваў! Хаця нясоладка было: тры вайны адпляскаў... мнагавата. Ды і без вайны жыццё мёдам не было... І ад чужых, і ад сваіх нацярпеўся...* (А. Дудараў).

Семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі звышфразавага адзінства дазваляюць кампенсаваць змест няпоўнай канструкцыі: *Без двух няпоўных месяцаў мне восемдзесят шэсць, яму было ўчора сорак сем. Калі віншаваў яго раненька па тэлефоне, пакуль не выйдзе на працу, само неяк сказалася: сынок* (Я. Брыль); *Потым пачала расказваць, як жыла раней, вясёлыя, смяшлівыя гісторыі... Яна, мусіць, хацела, каб Ніна, слухаючы гэтыя ўспаміны, забылася на свой боль* (І. Мележ).

Аналагічным спосабам ажыццяўляецца кампенсаторная функцыя дзейніка ў структуры складанага сінтаксічнага цэлага ў кітайскай мове. Сінтаксічныя адносіны спрыяюць структурнаму папаўненню незамешчанай сінтаксічнай пазіцыі і даюць фармальную кваліфікацыю канструкцыі. Найбольш часта паміж кампанентамі звышфразавага адзінства ўстанаўліваюцца адносіны паслядоўнасці: ***嵋有些累了，慢慢下坡。****觉得有什么跟着，回头见是柳，它轻轻摇着尾巴，脸上的表情极温顺，似乎在问：“让我送一程”* (**宗璞**，《东藏记》，第61页) (літар. *Мэй крыху стамілася, ідучы па горным схіле. Раптам* ***(Мэй)*** *адчула, што нехта ідзе ўслед за ёй, павярнула галаву і ўбачыла сабаку: яна, памахваючы хвастом, ласкава глядзела, быццам хацела сказаць: «Давай праводжу»*). Спрыяльныя ўмовы для структурна-сэнсавага папаўненя ствараюць адносіны паслядоўнасці паміж кампанентамі звышфразавага адзінства.

Дыферэнцыяльную функцыю выконваюць сінтаксічныя адносіны ўключэння: з іх дапамогай няпоўныя сказы адмяжоўваюцца ад несуб’ектна-прэдыкатыўных: ***当然****，这对我来说自然是天大的好事。那时候上大学不但不要钱，还给生活费呢*（**李佩甫**，«**生命册**»，**第**33页）(літар. *Конечно, это для меня, естественно, очень хорошее дело. Когда* ***(я)*** *учился в университете, не просто не платил, еще давали денег на расходы*).

Зрэдку назіраюцца выпадкі, калі кампенсаторная функцыя кампанентаў звышфразавага адзінства ажыццяўляецца на аснове адносін супраціўных: **塔娜在**这里时，**我**爱她，**被她迷得**头昏脑胀。*但一离开，时间一长，我这脑子里，连她的样子的轮廓都显不出来了* （**阿来**，《尘埃落定》，第169页）(літар. *Калі Таня была тут, я кахаў яе, быў зачараваны ёй. Але як толькі яна надоўга паехала, нават не мог згадаць, як яна выглядае*) і раздзяляльных: **她**说不清楚为谁而难过。*为李向前？为她自己？还是为别的什么人*（**路遥**，《**平凡的世界**》，**第**338页）(літар. *Яна не можа зразумець, дзеля чаго яна пакутвала.* ***(Яна пакутвала)*** *Або дзеля Лі Сянцянь? Або дзеля сябе? Або дзеля іншага чалавека?*).

Структурнае і функцыянальнае падабенства няпоўных канструкцый у беларускай і кітайскай мовах абумоўлена ўніверсальнымі моўнымі ўласцівасцямі – наяўнасцю незамешчанай сінтаксічнай пазіцыі і магчымасцю яе кампенсацыі на звышфразавым узроўні. Аднак пэўнае адрозненне паміж аналізуемымі мовамі назіраецца: у кітайскай мове кампенсаторны кампанент выконвае дыферэнцыяльную функцыю – адмяжоўвае няпоўныя канструкцыі ад несуб'ектна-прэдыкатыўных. Акрамя таго, у мовах ізаляванага тыпу спектр сінтаксічных адносін больш шырокі, адпаведна, відавы клас будзе большым.

У беларускай і кітайскай мове назіраюцца няпоўныя сказы з кампенсаторным кампанентам – *выказнікам.* Прамое дубліраванне кампанента ў кантэксце робіць магчымым кампенсацыю семантыкі без удзелу семантыка-сінтаксічных адносін паміж сказамі. Пры гэтым экспліцытна выражаны выказнік мае канстантны характар, указвае і на граматычнае значэнне апушчанага прэдыката: *У душы, як Божы знак: // Хата... Канюшына... Жыта... // Бульба... Бусел... Шпак... // Мроя... Хлопец закаханы... // Цемра... Шлях дамоў...* (Л. Дайнека); *Трое маіх сяброў ідуць па белай нерушы, і ланцужкі іх слядоў абрываюцца. Спачатку за адным, потым за другім, потым за трэцім* (У. Арлоў).

Аналагічна ажыццяўляецца кампенсаторная функцыя кампанентаў у структуры дыялагічнага адзінства: К у п а л к а. *Хіба бацькі не расказваюць табе казак, паданняў?* Х л о п ч ы к. *Расказваюць.* К у п а л к а. *Пра каго?* Х л о п ч ы к. *Пра Бураціна, пра Снежную каралеву, пра Дзюймовачку...* К у п а л к а *(расчаравана.) А-а-а... Пра мяне, значыць, забыліся.* Х л о п ч ы к. *Бабуля штось казала. Пачакай, я ўспомню* (Г. Каржанеўская). Рэплікі дыялога выступаюць у якасці кампенсаторных кампанентаў.

Асаблівасцю кітайскай мовы з'яўляецца адсутнасць дзеяслоўнага кіравання, таму няпоўныя сказы з апушчаным выказнікам назіраюцца рэдка. Узнаўленне апушчанага кампанента ў такіх сказах ажыццяўляецца шляхам дубліравання неназванага выказніка ў структуры звышфразавага адзінства: **襄垣**县离沁源县有一百多里，**从此逢年**过节，**老曹翻山越岭**，**到老**韩家串亲戚。*一年三次，端午节一次，八月十五一次，过年一次*（**刘震云**，《**一句**顶一万句》，第139页）(літар. *Стары Сяо наведвае свайго сябра Хана рэгу-*

*лярна.* ***(Наведвае)*** *тры разы на год: на свята Дуаньу адзін раз, 15 жнiўня адзін раз і на Новы год яшчэ адзін раз*). Часцей падобныя канструкцыі ўжываюцца ў структуры дыялагічнага адзінства, што тлумачыцца сэнсава-граматычнымі асаблівасцямі яго арганізацыі: *"韩木林送你回来的吗?"* ***"我自己"*** （张洁，**《无字》**，**第**414页）(літар. – *Хан Мулін правёў цябе дадому? – Я сама* ***(дайшла дадому)***).

Зрэдку назіраюцца няпоўныя сказы з пропускам даданых членаў сказа, у прыватнасці *дапаўненняў.* У беларускай мове такія выпадкі з'яўляюцца нешматлікімі, гэта тлумачыцца тым, што сінтаксічная пазіцыя дапаўнення з'яўляецца абавязковай не пры ўсіх дзеясловах, таму іх функцыянаванне абмежавана пэўнымі тыпамі прэдыкатыўнай семантыкі. Пераходны дзеяслоў можа адкрываць незамешчаную сінтаксічную пазіцыю, і ў такім выпадку канструкцыя кваліфікуецца як няпоўная: *Цікавасць выклікаюць і традыцыі ВНУ. Кожная ўстанова выпрацоўвае свае* (ЛіМ).

Найбольшая колькасць няпоўных канструкцый з кампенсаторным кампанентам-дапаўненнем выяўлена ў структуры дыялагічнага адзінства: *Яна зусім не здзівілася. Здзівіўся я, даведаўшыся, што гэта слова ёй знаёма. – Што ж, вельмі цікава. А чым вы зацікаўлены? Песнямі, прымаўкамі? – Легендамі, пані. Старымі мясцовымі легендамі* (У. Караткевіч); Д а ч к а. *Але і нашаму дасталося. Яму адарвалі вуха.* Т а т а. *Як вуха?* (А. Макаёнак). Гэта тлумачыцца асаблівасцямі структурнай арганізацыі дыялагічнай мовы: рэплікі ўяўляюць сабой структурна-сэнсавае адзінства, што дазваляе эксплiцытна выражаць толькі кампаненты, якія змяшчаюць новую інфармацыю.

У кітайскай мове звышфразавы тып з кампенсаторным кампанентам *дапаўненнем* назіраецца часцей, што абумоўлена наяўнасцю абавязковай сінтаксічнай пазіцыі дапаўнення ў мовах ізаляванага тыпу. Гэта значыць, што канструкцыі з пропускам дапаўнення кваліфікуюцца як няпоўныя незалежна ад статусу прэдыката. Эксплікацыя апушчанага дапаўнення ажыццяўляецца ў структуры звышфразавага адзінства: ***我****们是祖冲之的后代，难道快快一个东方大国，* ***就没有****优秀的？* ***我想一定有，有就去找，就去****请。你请不来，我去请；我也请不来，我找人去请*（**麦家**，**《暗算》**，**第**133页）(літар. *Мы нашчадкі Цзу Чунчжы, няўжо ў такой вялікай краіне не знойдзецца выдатнага матэматыка? Мне здаецца, што ёсць, трэба знайсці і запрасіць* ***(матэматыка)****. Калі ты не запросіш, то я зраблю гэта*).

Няпоўныя канструкцыі з кампенсаторным кампанентам *акалічнасцю* ў беларускай мове адсутнічаюць. Гэта тлумачыцца тым, што акалічнасць мае факультатыўны характар і яе неўжыванне не ўтварае незамешчаных сінтаксічных пазіцый. Такія сказы ў беларускай мове з'яўляюцца структурна і семантычна поўнымі. Выключэннем можна лічыць няпоўныя канструкцыі ў структуры дыялагічнага адзінства, дзе рэплікі «нанізваюцца» адна на другую, і таму патрэба дубліраваць неактуальную інфармацыю адпадае: – *Не, пачакай! – ухінуўшыся ад яго рукі, Брытвін шчоўкнуў курком, пакратаў прыцэльную рамку. Потым зірнуў на мушку. – А яшчэ казалі: Мелік'янц – строгі камандзір!*

*Сцёпка ўсё маўчаў, але пад елкай падазрона заёрзаў Даніла.*

*– Ды ён не Мелік'янца. Ён з кухні.*

*– Як з кухні?* (В. Быкаў);

*– Такія выпадкі маглі быць у тыя часы, – сцвердзіў я. – Прабачце, я прафан у геральдыцы. Яноўскія, мне здаецца, вядуцца на нашай зямлі з дванаццатага стагоддзя?*

*– З трынаццатага, – сказала яна* (У. Караткевіч);

*Маслакоў з жартоўнаю жвавасцю ў вачах агледзеў сваіх падначаленых.*

*– Не, не на чыгунку. У другі бок. На Кругляны.*

*– На Кругляны. А хто табе групу камплектаваў?*

*– А што – кепская група? Сам падбіраў* (В. Быкаў).

У кітайскай мове падобныя канструкцыі функцыянуюць вельмі шырока. Гэта тлумачыцца адсутнасцю сінтагматычных сувязей паміж кампанентамі, а значыць немагчымасцю кампенсаваць апушчаную акалічнасць, акрамя дубліравання яе ў кантэксце:

***老**杨更觉得老马的主意高明。比老马主意更高明的，**是老**杨的主意，**两个儿子中**，**只**选一个上新学。让两个人同去（**上学**）**他**们觉得是应该，**两个人中**选一个*（**刘震云**，《**一句**顶一万句》，**第**23页）(літар. *Лао Ян лічыць, што ідэя Лао Мая была добрай. На самой справе ідэя Лао Ян аказалася лепшай. Сутнасць яе ў тым, што з двух сыноў выбіраецца адзін, і яго адпраўляюць вучыцца ў школу. Калі двое разам пойдуць* ***(у школу)****, яны падумаюць, што так і трэба, таму выбіраюць аднаго з двух).*

Аднак найбольш выразна кампенсаторная функцыя акалічнасці рэалізуецца ў структуры дыялагічнага адзінства. Кампенсаторны кампанент указвае на розныя абставіны працякання працэсу: ***曹青娥从沁源**县牛家庄到襄垣县温家庄看娘，**两个吵了半**辈子架的人，**开始相互**说得着。两人说得着，**就有**说不完的话。曹青娥不管住三天，**住五天**，**或住十天**，**两人每天**说话都到半夜*（**刘震云**，《**一句**顶一万句》，第184页）(літар. *Цао Цынь Э наведвала маці ў паселку Вэнь раёна Сянь Юань, яны пасварыліся даўно, зараз памірыліся, размаўляюць адна з адной. Калі яны пачынаюць размаўляць – размаўляюць бясконца. Колькі б ні знаходзілася Цао Цинъ Э* ***(у пасёлку Вэнь)****, – тры дні, пяць дзён, дзесяць, кожны дзень яны размаўляюць да ночы*); *"**今天你要不要到社里去？**"觉民问道。"**我看**还是不去好，"**琴想了想回答道。她**还鼓舞他道："**你一个人去也好。横**竖你可以代表我。"*（**巴金**，《**秋**》，**第**355页）(літар. *– Ты сення пойдзеш у рэдакцыю газеты? – Думаю, што не пайду* ***(у рэдакцыю газеты)****. Цінь падумала і сказала: – Ты пойдзеш* ***(у рэдакцыю газеты)*** *адзін. Ты зможаш прадставіць мяне* ***(у рэдакцыі газеты)***).

Шырокае функцыянаванне няпоўных дыялагічных сказаў тлумачыцца лёгкасцю ўзнаўлення прапушчанага кампанента.

У ходзе праведзенага даследавання намі выяўлены няпоўныя звышфразавыя канструкцыі з кампенсаторнымі кампанентамі *дзейнікам*, *выказнікам*, *дапаўненнем* і *акалічнасцю*. Дзейнік, які выступае ў якасці

кампенсаторнага кампанента, выконвае дыферэнцыяльную функцыю – адмяжоўвае няпоўны двухсастаўны сказ ад няпэўна-асабовага ў беларускай мове і няпоўны двухсастаўны ад несуб'ектна-прэдыкатыўнага ў кітайскай мове.

Папаўненне апушчанага кампанента ў канструкцыях з нулявым выказнікам ажыцяўляецца спосабам прамога дубліравання кампанента. У кітайскай мове падобныя канструкцыі функцыянуюць рэдка, што абумоўлена адсутнасцю ў ёй дзеяслоўнага кіравання.

Няпоўныя канструкцыі з кампенсаторным кампанентам *дапаўненнем* у беларускай мове назіраюцца рэдка, што тлумачыцца асаблівасцю дзеяслоўнага кіравання ў беларускай мове: сінтаксічная пазіцыя дапаўнення выступае абавязковай толькі пры пераходных дзеясловах, а значыць іх колькасць будзе нязначная. Больш шырокі відавы клас няпоўных канструкцый з апушчаным дапаўненнем выяўлены ў кітайскай мове, што абумоўлена адсутнасцю ў ёй граматычных форм. Фактар адсутнасці маркераў граматычных значэнняў дазваляе свабодна функцыянаваць у кітайскай мове няпоўным канструкцыям з апушчанай акалічнасцю.

Аналіз і сістэматызацыя няпоўных канструкцый у беларускай і кітайскай мовах праводзіўся на аснове ўніверсальных і спецыфічных параметраў іх тыпалогіі. Універсальнымі параметрамі тыпалогіі лічым магчымасць структурнай дыферэнцыяцыі канструкцый у беларускай і кітайскай мовах і катэгорыю сінтаксічнай непаўнаты ў іх, да спецыфічных – асаблівасці сінтаксічнай сувязі кампанентаў і парадак слоў у аналізуемых мовах.

Тыпалагічнай асаблівасцю кітайскай мовы з'яўляецца адсутнасць маркераў сінтаксічнай сувязі, што кваліфікуе характар кампанентаў сказа як раўназначны. Таму ў названай мове любы кампанент – дапаўненне, азначэнне, акалічнасць, прыназоўнік – можа выступаць як кампенсаторны, бо дыферэнцыруе няпоўны сказ ад поўнага. Аўтаномнасць сінтаксічных пазіцый у мовах ізаляванага тыпу адкрывае магчымасці для кампенсацыі апушчанага члена семантычна тоесным кампанентам без уліку яго граматычнай маркіроўкі. У працэсе кампенсацыі апушчанага члена ў кітайскай мове можа мяняцца яго сінтаксічны статус, у выніку чаго ўтвараюцца бінарныя парадыгмы апушчанага і кампенсаторнага кампанентаў.

Важным параметрам сістэматызацыі выступае парадак слоў, які істотна ўплывае на тыпа- і відаўтварэнне няпоўных канструкцый у кітайскай мове. Названы параметр дазваляе выдзеліць у мовах ізаляванага тыпу перадпазіцыйныя і постпазіцыйныя няпоўныя канструкцыі на ўзроўні поліпрэдыкатыўнай сінтаксічнай адзінкі. Пры гэтым на кваліфікацыю няпоўных канструкцый на ўзроўні звышфразавага адзінства парадак слоў істотна не ўплывае.

## ЛІТАРАТУРА

1. 黎,锦熙. 新著国语文法 / 黎锦熙. – 长沙: 湖南教育出版社, 2007, 347页 (*Ли, Цзинси*. Грамматика китайского языка / Ли Цзинси. – Чанша : Хунан. Обра. изд-во, 2007. – 347 с.).

2. 黄，伯荣. 现代汉语.下册 / 黄伯荣，廖序东. – 北京：高等教育出版社，2007，261页. (*Хуан*, *Божунь*. Современный китайский язык. последняя часть / Хуан Божунь, Ляо Сюйдунь. – Пекин : Изд-во Высш. обр., 2007. – 261 с.).
3. 范，晓. 语法理论纲要 / 范晓，张豫峰. – 上海:上海译文出版社, 2003, 549页 (*Фан, Сяо*. Очерки грамматической теории / Фан Сяо, Чжан Юйфэн. – Шанхай : Шанхайск. изд-во пер., 2003. – 549 с.).
4. *Harma, J.* Sur l'omission du verbe et sa recuperabilité en français / J. Harma // Actes du 9e Congrès des romanistes scandinaves, Helsinki, 13–17 aout 1984. – Helsinki, 1986. – P. 135–146.
5. *Грудева, Е. В.* Избыточность и эллипсис в русском письменном тексте / Е. В. Грудева. – Череповец : Черепов. гос. ун-т, 2007. – 251 с.
6. *Лекант, П. А.* К проблеме неполных предложений в русском языке / П. А. Лекант // Учен. зап. – Моск. обл. пед. ин-т. – М., 1963. – Т. 139, вып. 9 : Русский язык и литература. – С. 43–49.
7. *Золотова, Г. А.* К вопросу о неполных предложениях / Г. А. Золотова // Русский язык : сб. тр. : посвящ. памяти д-ра филол. наук, проф. Николая Николаевича Прокоповича ; редкол. : Л. Ю. Максимов [и др.]. – М., Моск. гос. пед. ин-т, 1975. – С. 106–118.
8. 王，维贤. 现代汉语语法理论研究 / 王维贤. – 北京:语文出版社, 1997, 300页 (*Ван, Вэйсянь*. Теоретическая грамматика современного китайского языка / Ван Вэйсянь. – Пекин : Изд-во китайск. Яз., 1997. – 300 с.).
9. 朱,德熙. 现代汉语语法研究 / 朱德熙. - 北京:商务印书馆, 1997, 224页 (*Чжу, Дэси*. Исследование грамматики современного китайского языка / Чжу Дэси. – Пекин : Коммерческое изд-во, 1997. – 224с.).
10. *Кибрик, А. Е.* Константы и переменные языка / А. Е. Кибрик ; Моск. гос. ун-т, филол. фак. – СПб. : Алетейя, 2005. – 719 с.
11. *Мельников, Г. П.* Системная типология языков: принципы, методы, модели / Г. П. Мельников ; Рос. акад. наук, Ин-т языкознания. – М. : Наука, 2003. – 393 с.
12. *Циммерлинг, А. В.* Типологический синтаксис скандинавских языков / А. В. Циммерлинг. – М. : Яз. славян. культуры, 2002. – 895 с.
13. 陈,昌来. 现代汉语句子 / 陈昌来. – 上海: 华东师范大学出版社, 2000, 313页 (*Чэн, Чанлай*. Современные китайские синтаксические системы / Чэн Чанлай. – Шанхай : Изд-во Восточно-китайск. пед. ун-та, 2000. – 313 с.).

The article explores the structural organization of incomplete sentences in Belarusian and Chinese. Universal and specific parameters of syntax typology of units in languages of flective and isolating types are revealed – structural differentiation of sentences, peculiarities of syntactic connection and the word order in them are revealed. Superphrasal types of incomplete sentences in Belarusian and Chinese were identified and systematized. The factors of their type and category formation were identified as well.

*Поступила 19.09.2019*